І.І. Кірчук,
старшы выкладчык кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»,
кіраўнік гурта «Этна-трыа “Троіца”»

# Актуальнасць праграмы вучэбнай дысцыпліны «Асновы этнаграфіі і фальклору» па спецыяльнасці перападрыхтоўкі «Культурна-адпачынкавая дзейнасць»

У новым тысячагоддзі дзякуючы нацыянальнаму адраджэнню ўзнікла цікавасць да свайго мінулага, гісторыі, культуры, у тым ліку да народных традыцый, звычаяў, абрадаў. У канцы XIX — пачатку XX ст. звычаі і абрады беларусаў уяўлялі сабой стройную сістэму, у якой знайшлі адлюстраванне пытанні культуры, быту, філасофіі, рэлігіі, светаўспрымання і светаасэнсавання — усяго, што складае духоўную культуру народа.

Адраджэнне ці нават рэканструкцыя таго ці іншага свята — справа нялёгкая. Перш трэба даследаваць вытокі культуры кожнага рэгіёна Беларусі, абмяняцца вопытам, назапашаным тэкставым, меладычным, інструментальным і харэаграфічным матэрыялам, прыдатным для правядзення свят і рэканструкцыі звычаяў і абрадаў.

Гэтай мэце і прысвечана вывучэнне ў Інбелкульце вучэбнай праграмы «Асновы этнаграфіі і фальклору» па спецыяльнасці перападрыхтоўкі «Культурна-адпачынкавая дзейнасць», адрасаванай спецыялістам дамоў культуры, клубных устаноў і метадычных цэнтраў.

Важным з’яўляецца выкарыстанне падчас выкладання выданняў, прысвечаных этнаграфіі і фальклору [3], у тым ліку гістарычнага запісу беларускіх свят і абрадаў за два стагоддзі — 50 тамоў серыі «Беларуская народная творчасць» Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. У ім ёсць грунтоўныя артыкулы вядомых фалькларыстаў, дзе раскрываюцца паходжанне і змест свят, даецца гісторыя іх запісаў, вывучэння, аналізуюцца выданні і інш. Тут разглядаюцца мелодыя, спеў, гучанне музычных інструментаў, рытмы, скокі, танец, вопратка, маскі і, нарэшце, адпаведнае прыроднае асяроддзе, пара года, месца, якое фарміруе мастацкі каларыт.

Сёння ва ўмовах сусветнай глабалізацыі і індустрыялізацыі праблема рэальнага далучэння моладзі да нацыянальнай культуры ўскладнілася. Патрэбны сучасныя падыходы да выхавання і адукацыі моладзі. Задача дысцыпліны «Асновы этнаграфіі і фальклору» — даць творчы імпульс слухачу, настроіць яго на разнастайныя формы працы з калектывамі, перш за ўсё з дзіцячымі, бо менавіта дзіцячы фальклор — гэта першая школа патрыятычнага і ідэалагічнага выхавання.

На жаль, і ва ўласных сем’ях, і ў практыцы адукацыйных устаноў мы далёка не поўна выкарыстоўваем найбагацейшы педагагічны патэнцыял, створаны нашымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

продкамі. Круглыя сталы па тэме «Дзіцячы фальклор. Сучасны стан. Рэпертуар дзіцячага калектыву» паказваюць шмат памылак і недапрацовак. Напрыклад, увядзенне ў рэпертуар дзіцячых калектываў фрагментаў вясельнага абраду, любоўных і сямейна-бытавых песень недапушчальна пры дыферэнцыраваным выхаванні (асабліва гэта адносіцца да дзяцей малодшага ўзросту).

Большая частка праграмы дысцыпліны «Асновы этнаграфіі і фальклору» прысвечана вывучэнню народных песень розных рэгіёнаў, якія не толькі адлюстроўваюць гісторыю, сувязь пакаленняў, але і з'яўляюцца значнай культурнай каштоўнасцю (фальклорная песня, сцэнічнае пераасэнсаванне фальклорнай песні, новыя аранжыраваныя творы). Абмеркаванне музычнага матэрыялу са слухачамі паказвае недахоп выданняў народных песень да свят у рэгіёнах.

Раздзел праграмы «Інтэрпрэтацыя свят» прысвечаны перанясенню свят на сцэну, радыё і тэлебачанне. У такіх выпадках недапушчальныя спрашчэнне, скажэнне, фальсіфікацыя. Пры інтэрпрэтацыі спецыялісты павінны прытрымлівацца самабытных рэгіянальных з'яў (тэатралізацыя, пераапрананне, ужыванне масак, песень, танцаў).

Найбольш складана ідзе падрыхтоўка такіх масавых свят, як «Купалле» і «Каляда», з-за вялікага інфармацыйнага патоку (СМІ, інтэрнэт, тэле- і радыёкрыніцы). Імкненне капіраваць папулярныя шоу-праграмы прыводзіць да змешвання рускага, украінскага, беларускага і польскага фальклору, што з'яўляецца парушэннем мясцовых традыцый, вядзе да страты рэгіянальнага і нацыянальнага каларыту.

Галоўная мэта дысцыпліны «Асновы этнаграфіі і фальклору» — раскрыць гістарычныя вытокі, адметныя рысы быту і культурныя традыцыі беларускага народа; скіраваць увагу на выкарыстанне нацыянальнага каларыту пры пераасэнсаванні і рэканструкцыі свят.

Акрэсленая мэта дыктуе наступныя задачы:

развіццё мастацкага густу;

узбагачэнне музычнага кругагляду на лепшых узорах беларускага фальклору;

выхаванне розных бакоў музычнага слыху (меладычна-інтанацыйнага, ладавага, гарманічнага);

стварэнне рэгіянальнага стылю выканання (гуказдабыванне, дыханне, дыкцыя, тэмбр);

валоданне рознымі відамі народных спеваў;

засваенне сучаснай методыкі работы з фальклорнымі калектывамі.

Слухачы знаёмяцца з прынцыпамі тэатралізацыі песеннага фальклору, выкарыстаннем адпаведных атрыбутаў народнага мастацтва (музычнымі інструментамі, народным адзеннем).

Яны вучацца раскрываць змест гульнёвых, карагодных, танцавальных і іншых песень пры дапамозе драматычных прыёмаў і сродкаў, пераапранання, народнага тэатру; выпрацоўваюць навыкі і ўменні выконваць неабходныя рухі, мізансцэны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вывучаюць асновы народнай харэаграфіі, пантамімы, пластыкі, сцэнічнай мовы.

Вялікая значэнне надаецца развіццю творчай фантазіі пры рабоце над падрыхтоўкай сцэнарыя, тэкстаў, музіцыраванню на народных беларускіх інструментах, апрацоўцы народных песень.

Падчас заняткаў адбываецца абмен вопытам і пераймание лепшых тэндэнцый захавання традыцыйнай культуры.

Разнастайныя мерапрыемствы, звязаныя з захаваннем і прэзентацыяй традыцыйнай культуры кожны год праходзяць у гарадах і вёсках Беларусі. Гэта знакамітыя музычныя і тэатральныя форумы, фестывалі народнай культуры, старажытных рамёстваў і нацыянальнай кухні, велікасвецкія балі, рыцарскія турніры і рэканструкцыі эпохі Сярэдневякоўя, незвычайныя экалагічныя святы.

Можна пабачыць і абсалютна ўнікальныя, характэрныя толькі для адной мясцовасці абрады, напрыклад: «Калядныя цары» (в. Семежава, Капыльскі р-н, Мінская вобл.), «Цягнуць Каляду на дуба» (в. Новіны, Бярэзінскі р-н, Мінская вобл.), «Жаніцьба Цярэшкі» (в. Аношкі, Лепельскі р-н, Віцебская вобл.). Усе гэтыя мерапрыемствы разглядаюцца на практычных занятках з мэтай аналізу і пашырэння лепшага вопыту ў межах краіны.

Практычныя заняткі праходзяць у спецыялізаванай аўдыторыі «Этналабараторыя». Асаблівая атмасфера ўзнаўлення і асэнсавання рэха традыцый, значная колькасць унікальных рэчаў (музычных інструментаў, строяў і інш.) з розных краін свету, шырокі навукова-дапаможны фонд (у электронным выглядзе) спрыяюць павышэнню прафесійнага ўзроўню спецыялістаў, дапамагаюць ім авалодаць спосабамі работы работы з этнаматэрыялам.

Стварэнне этналабараторыі ў Інбелкульце, правядзенне практычных заняткаў па актуальных для спецыялістаў-практыкаў тэмах, майстар-класаў [1] спрыяе павышэнню прафесійнага ўзроўню работнікаў сферы культуры, засваенню імі новых тэхнік і тэхналогій у межах вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Асновы этнаграфіі і фальклору».

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Адкрыццё Этналабараторыі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://inbelkult.by. — Дата доступа : 14.07.2016.
2. Образовательный стандарт Республики Беларусь. Переподготовка руководящих работников и специалистов, имеющих среднее специальное образование. Специальность 2-23 02 72 «Культурно-досуговая деятельность» / Е.А. Макарова, А.А. Кушнеревич, 2012. — 14 с.
3. Этнаграфія Беларусі : энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл.) ; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал.рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелСЭ, 1989. — 575 с.: іл.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ